*1 лістапада 2025 г. (у парафіях — Фацімскі ружанец)*

*8 лістапада 2025 г. (у Будславе — звычайны ружанец)*

# Н А В Э Н Н А

## Найдаражэйшая Кроў Хрыста, умацуй нас!

З нагоды малітоўнай падрыхтоўкі да прысвячэння Мінска-Магілёўскай мітраполіі Найдаражэйшай Крыві Пана нашага Езуса Хрыста і ўдзячнасці за 35 гадоў аднаўлення структураў Каталіцкага Касцёла ў Беларусі

***Заклік:*** Кроў Хрыста, збаўленне душаў чыстцовых, — выбаў нас.

***Інтэнцыя:*** Молімся за памерлых святароў і кансэкраваных асобаў, за памерлых удзельнікаў рэлігійных рухаў, а таксама за тых, хто загінуў ад пераследу за веру, і за душы, церпячыя ў чыстцы.

*(Чытаецца трэцяя частка Ружанца Балесныя таямніцы, ці на выбар)*

## ПАРАДАК НАВЭННЫ

1. Ружанец.
2. Святая Імша *(у Будславе).*
3. Перапынак / Пасілак *(у Будславе).*
4. Даклад прадстаўніка адказнай манаскай кангрэгацыі ці ордэну *(у Будславе).*
5. Разважанні на кожны дзень Навэнны.
6. Вяночак да Божай Міласэрнасці.
7. Літанія да Найдаражэйшай Крыві Пана нашага Езуса Хрыста.
8. Малітва да Крыві Хрыстовай.

*Фрагменты Святога Евангелля ў разважаннях пададзены паводле выдання: «Новы Запавет» (Мінск: Про Хрысто, 2017. Разважанні падрыхтаваныя паводле энцыклікі «Ecclesia de Eucharistia» святога Яна Паўла II і іншых дакументаў Каталіцкага Касцёла. Тэкст перапрашэння Беззаганнага Сэрца Марыі, змешчаны пасля разважання кожнай таямніцы, пададзены паводле выдання: «Дзеля трыўмфу Беззаганнага Сэрца Марыі. Набажэнствы ў першыя суботы месяца» (Мінск: Про Хрысто, 2023). Малітвы паводле малітоўніка «Ойча наш» (Мінск: Про Хрысто, 2022).*

## Ружанец перапрашэння Беззаганнага Сэрца Марыі

## Адарацыя Найсвяцейшага Сакрамэнту

*Спеў на выстаўленне: О збаўча Гостыя...*

Схілім галовы перад нашым Панам, укрытым у таямніцы Найсвяцейшага Сакрамэнту. Няхай усе сэрцы адкрыюцца на прысутнасць Бога. Паўтарайма словы малітвы Анёла з Фацімы:

О Божа мой, веру ў Цябе, праслаўляю Цябе, давяраю Табе і люблю Цябе.

Прашу ў Цябе прабачэння для тых, хто не верыць у Цябе, не праслаўляе Цябе, не давярае Табе і не любіць Цябе.

О Найсвяцейшая Тройца — Айцец, Сын і Дух Святы.

З глыбокаю пакораю хвалу Табе аддаю і ахвярую Табе Найсвяцейшае Цела і Кроў, Душу і Боскасць Пана нашага, Езуса Хрыста, прысутнага на ўсіх алтарах свету, як перапрашэнне за знявагі, святатацтва і абыякавасць, якімі Яго абражаюць.

Праз бясконцыя заслугі Яго Найсвяцейшага Сэрца і праз заступніцтва Беззаганнага Сэрца Марыі прашу ў Цябе ласкі навяртання бедных грэшнікаў.

## Акт прысвячэння Беззаганнаму Сэрцу Маці Божай

Беззаганная Маці Бога, Твой Сын хацеў, каб мы прынялі Цябе як Маці і каб Ты навучыла нас ісці следам за Ім. Ён жадаў, каб Ты падтрымлівала нас сваёю матчынаю апекаю. Твайму Беззаганнаму Сэрцу аддаём усё нашае жыццё, нашую радасць і смутак. Няхай нашае жыццё стане гімнам праслаўлення Бога.

Прысвячаем Табе сем'і нашага краю. Няхай яны стануць падобнымі да Тваёй сям'і ў Назарэце, каб усе адчувалі і спазнавалі ў іх любоў Бога.

Тваёй апецы аддаём увесь Касцёл, асабліва яго пастыраў. Выпрасі нам у свайго Сына ласку любові да Касцёла, які так часта на працягу гісторыі праходзіў праз выпрабаванні.

Аддаём Табе дзяцей і моладзь нашай краіны. Выпрасі для нашага народа шматлікія пакліканні да святарства і кансэкраванага жыцця.

Выпрасі таксама святасць для сужэнцаў.

Даручаем Табе хворых і церпячых. Будзь з намі, калі слабее наша надзея. Заступіся за нас, каб мы станавіліся ўсё больш сумленнымі і праведнымі людзьмі.

Твайму Беззаганнаму Сэрцу давяраем нашую сучаснасць і будучыню. Амэн.

## Малітва перад Ружанцам

*Молімся:* О Марыя, праз набажэнствы першых суботаў месяца прагнем перапрасіць за пяць відаў знявагаў і абразаў Твайго Беззаганнага Сэрца. Прымі гэтае наша перапрашэнне за блюзнерствы, скіраваныя супраць Твайго Беззаганнага Зачацця, Твайго Дзявоцтва і Твайго Божага Мацярынства. Ахвяруючы Табе гэтае наша перапрашэнне, просім прабачэння для тых, хто не прызнае Цябе за Маці ўсяго чалавецтва і хто сее ў сэрцах дзяцей абыякавасць, ігнараванне і нават нянавісць да Цябе. Урэшце прагнем перапрасіць за знявагі, прычыненыя Табе тымі, хто зневажае Твае святыя выявы.

Маці Божая, аддаем Табе нашыя сэрцы. Ачысці іх, распалі ў іх любоў. Выпрасі нам святло Духа Святога, каб мы маглі пазнаць волю Божую і выканаць яе з Тваёй дапамогаю.

Жадаючы суцешыць і перапрасіць Тваё Беззаганнае Сэрца, распачынаем малітву Святога Ружанца.

## Святы Ружанец

**Веру ў Бога,** Айца ўсемагутнага, Стварыцеля неба і зямлі, і ў Езуса Хрыста, Сына Яго адзінага, Пана нашага, які быў зачаты ад Духа Святога, нарадзіўся з Дзевы Марыі, замучаны пры Понцкім Пілаце, укрыжаваны, памёр і быў пахаваны; зышоў да адхлані, на трэці дзень уваскрос з памерлых, узышоў на неба, сядзіць праваруч Бога Айца ўсемагутнага, адтуль прыйдзе судзіць жывых і памерлых. Веру ў Духа Святога, святы Касцёл каталіцкі, еднасць святых, адпушчэнне грахоў, уваскрашэнне цела, жыццё вечнае. Амэн.

**Ойча наш,** каторы ёсць у небе, свяціся імя Тваё, прыйдзі Валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння і адпусці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым, і не ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога. Амэн.

**Вітай, Марыя,** поўная ласкі, Пан з Табою, благаслаўлёная Ты між жанчынамі і благаслаўлёны плод улоння Твайго, Езус. Святая Марыя, Маці Божая, маліся за нас, грэшных, цяпер і ў хвіліну смерці нашай. Амэн. *(3 разы)*

**Хвала Айцу** і Сыну, і Духу Святому. Як была спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амэн.

## Балесныя таямніцы

### I. Малітва Езуса ў садзе Аліўным.

З Евангелля паводле св. Лукі

*[Езус] адышоў ад іх, укленчыў і маліўся, кажучы: «Ойча, калі Ты жадаеш, адхілі ад Мяне гэты келіх. Але не Мая воля, а Твая няхай станецца». З'явіўся Яму анёл з неба, суцяшаючы Яго. І, моцна пакутуючы, Ён маліўся яшчэ больш. А пот Ягоны быў, быццам кроплі крыві, што падалі на зямлю (гл. Лк 22, 41–44).*

…Устанаўленне Эўхарыстыі сакрамэнтальным чынам папярэджвала падзеі, якія ў хуткім часе павінны былі наступіць, пачынаючы ад канання ў Гетсіманіі. Зноў бачым Пана Езуса, які выходзіць з Вячэрніка, спускаецца з вучнямі ўніз, каб перайсці паток Кедрону і ўвайсці ў Аліўны сад. Хрыстус на малітве перажываў смяротную трывогу, і «пот Ягоны быў, быццам кроплі крыві, што падалі на зямлю» (Лк 22, 44). Распачыналася праліццё Крыві — тае самай Крыві, якую крыху раней Ён ахвяраваў Касцёлу як напой збаўлення ў сакрамэнце Эўхарыстыі; канчаткова яна будзе пралітая на Галгоце і станецца прыладаю нашага Адкуплення (*Ecclesia de Eucharistia, 3*).

*Маці Божая, Ты на працягу стагоддзяў запальвала сэрцы сваіх дзяцей чуйнай любоўю, адары нас ласкаю глыбокай малітвы перад Тваім Сынам, прысутным у Найсвяцейшым Сакрамэнце.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

Пасля кожнай таямніцы чытаем:

*Няхай будзе праслаўлёны Найсвяцейшы Сакрамэнт, праўдзівае Цела і Кроў Пана нашага Езуса Хрыста.*

*О мой Езу, прабач нам грахі нашыя, захавай нас ад агню пякельнага, правядзі ўсе душы на неба і дапамажы асабліва тым, каму найбольш патрэбна Твая міласэрнасць.*

*О Марыя, без граху першароднага зачатая, маліся за нас, хто ў Цябе паратунку шукае, і за тых грэшных, хто Табою пагарджае, асабліва за ворагаў Касцёла і даручаных Табе.*

*Найсвяцейшае Сэрца Езуса, прыйдзі Валадарства Тваё праз Беззаганнае Сэрца Марыі.*

**II. Бічаванне Езуса.**

З Евангелля паводле св. Мацвея і св. Яна

*Пілат сказаў ім: «А што мне рабіць з Езусам, якога завуць Хрыстом?» Усе закрычэлі: «Няхай будзе ўкрыжаваны!» <...> І ўвесь народ адказаў: «Кроў Яго на нас і на дзецях нашых» (Мц 27, 22. 25). Тады Пілат узяў Езуса і аддаў на бічаванне (Ян 19, 1).*

Становячыся Чалавекам болю, [Езус] усталяваў новую салідарнасць паміж Богам і цярпеннямі чалавецтва. <...> Ён усё гэта ўчыніў з любові да нас, каб паказаць людзям сваю любоў, каб кампенсаваць за іх грэх і ад раз'яднання прывесці іх да адзінства. Ён усё гэта ўчыніў, бо любоў Хрыста была адлюстраваннем любові Бога да людзей <...>. Перад абліччам гэтай таямніцы можна сказаць, што без цярпення і смерці Хрыста любоў Бога да чалавецтва не адкрылася б ва ўсёй сваёй глыбіні і велічы. А з іншага боку, цярпенне і смерць, дзякуючы Хрысту, сталі заахвочваннем, стымулам, пакліканнем да больш ахвярнай любові *(Ян Павел II, Z katechezy środowej, 19.10.1988 r.).*

Кроў, пралітая пры бічаванні, — гэта кроў новага запавету, які Бог заключыў з намі. Эўхарыстыя робіць жывой і сапраўднай тую ахвяру, якую Хрыстус здзейсніў. Прымаючы Эўхарыстыю, мы не проста ўспамінаем цярпенні Хрыста — мы рэальна яднаемся з Ім, удзельнічаем у Яго ахвяры і атрымліваем магчымасць прыняць гэтую ахвяру ў сэрца, умацавацца ў веры і жыць па-хрысціянску.

*Маці Збавіцеля, Ты найлепш ведаеш, што ў нашым жыцці найбольш балюча раніць Твайго Сына. Выпрасі для нас ласку верна і пабожна перажываць вялікую таямніцу веры — Эўхарыстыю.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**III. Укаранаванне Езуса церdroid.**

З Евангелля паводле св. Мацвея

*А жаўнеры намесніка, завёўшы Езуса ў прэторыю, сабралі каля Яго цэлую кагорту. І, распрануўшы Яго, надзелі на Яго пурпуровы плашч. І, сплёўшы вянок з церняў, усклалі Яму на галаву і далі Яму ў правую руку трысціну. Становячыся перад Ім на калені, насміхаліся з Яго, кажучы: «Вітай, кароль юдэйскі!» І плявалі на Яго, бралі трысціну і білі Яго па галаве (Мц 27, 27–30).*

«Пан Езус у тую ноч, калі быў выданы» (1 Кар 11, 23), устанавіў эўхарыстычную Ахвяру свайго Цела і сваёй Крыві. <...> У ёй — незабыўны запавет мукі і смерці Пана. Эўхарыстыя — гэта не толькі прыбліжэнне тае падзеі, але яе сакрамэнтальнае здзяйсненне. Гэта ахвяра Крыжа, якая жыве на працягу стагоддзяў. Гэтую праўду добра перадаюць словы, якімі ў лацінскім абрадзе вернікі адказваюць на прамоўленую святаром акламацыю: «Гэта вялікая таямніца веры» — «Абвяшчаем смерць Тваю, Пане Езу!».

Касцёл атрымаў Эўхарыстыю ад Хрыста, свайго Пана, не ў якасці аднаго з многіх каштоўных дароў, але як найвялікшы дар, бо гэта дар самога сябе, дар уласнай асобы ў яе святой чалавечнасці, а таксама дар Яго справы збаўлення. (*Ecclesia de Eucharistia*, 11).

*Маці Балесная, Ты і сёння пакутуеш з-за знявагаў Найсвяцейшага Сэрца Твайго Сына і Твайго Беззаганнага Сэрца, прымі гэтыя нашыя малітвы, няхай яны стануць нашым перапрашэннем і ўміласціўленнем.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**IV. Езус нясе крыж на гару Кальварыйскую.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*Калі павялі Яго [на ўкрыжаванне], схапілі нейкага Сымона Кірэнэйца, які вяртаўся з поля, і ўсклалі на яго крыж, каб нёс за Езусам. Ішло за Ім вялікае мноства людзей і жанчын, якія плакалі і галасілі па Ім. А Езус абярнуўся да іх і сказаў: «Дочкі ерузалемскія, не плачце па Мне, а плачце па сабе і па дзецях вашых» (Лк 23, 26–28).*

Як уявіць сабе пачуцці Марыі, якая чула з вуснаў Пятра, Яна, Якуба і іншых Апосталаў словы з Апошняй Вячэры: «Гэта Цела Маё, якое за вас будзе выдана» (Лк 22, 19)? Гэта Цела, выдадзенае на ахвяру і зноў узгаданае ў сакрамэнтальных знаках, было тым самым целам, якое зачалося ў Яе ўлонні! Прыняцце Эўхарыстыі павінна было азначаць для Марыі як бы паўторнае прыняцце ў Яе ўлонні сэрца, якое білася ў рытме Яе сэрца паўторным перажываннем таго, што асабіста Яна перажыла пад крыжам (*Ecclesia de Eucharistia, 56).*

*Маці Божая, Ты выхоўваеш нас у духу ахвярнай любові, выпрасі нам ласку заўсёды заставацца вернымі той праўдзе, што, ідучы за Хрыстом, мы павінны адрачыся ад саміх сябе і з пакораю прымаць свой штодзённы крыж.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**V. Укрыжаванне і смерць Езуса.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*Калі прыйшлі на месца, званае Чэрап, укрыжавалі там Яго і злачынцаў, аднаго з правага, другога з левага боку. А Езус сказаў: «Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць». <...> Было ўжо каля шостай гадзіны, і цемра настала па ўсёй зямлі аж да гадзіны дзявятай. <...> А Езус закрычаў моцным голасам: «Ойча, у рукі Твае аддаю дух Мой». І, сказаўшы гэта, сканаў (Лк 23, 33–34. 44. 46).*

Эўхарыстыя, дзякуючы сваёй цеснай сувязі з ахвяраю на Галгоце, з'яўляецца ахвяраю ў поўным сэнсе, а не толькі ў сэнсе агульным, як бы толькі гаворка ішла пра звыклы дар Хрыста ў якасці духоўнай спажывы для вернікаў, бо дар Яго любові і Яго паслухмянасці ажно да апошняга ўздыху (пар. Ян 10, 17-18) — гэта перадусім дар для Яго Айца. Зразумела — гэта дар таксама для нас, больш за тое, для ўсяго чалавецтва, але галоўным чынам — гэта дар для Айца, гэта таямніца ахвяры, якую Айцец прыняў, адказваючы ўзаемнасцю на бязмежную адданасць свайго Сына, калі Той стаў паслухмяны ажно да смерці (пар. Флп 2, 8), сваёю Айцоўскаю адданасцю *(Ecclesia de Eucharistia, 13).*

*Маці Божая, Ты стаіш пад крыжам, зраненая цярпеннямі і кананнем свайго Сына, але, нягледзячы на балесны меч у Тваім Сэрцы, застаешся вернай кожнаму чалавеку, які праз смерць Хрыста нарадзіўся для новага жыцця з Богам.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

## Малітва на заканчэнне Ружанца

Каралева Ружанца Святога, наша Фацімская Пані! Дзякуем Табе за дапамогу, якую Ты нам аказала. Тваё Фацімскае пасланне — гэта праява Мацярынскай любові. Ты прагнеш усіх уратаваць і кожнага хочаш правесці на Неба.

Хвала і праслаўленне Айцу і Сыну, і Духу Святому за гэтую поўную велічы Каралеву Неба, за Яе Фацімскае пасланне і за выслухоўванне нашых просьбаў. Амэн.

## Літанія да Найсвяцейшай Панны Марыі *(Ларэтанская)*

Кірые, элейсон, *Хрыстэ, элейсон, Кірые, элейсон,*
Хрыстэ, пачуй нас, *Хрыстэ, выслухай нас.*
Ойча з неба, Божа, – *змілуйся над намі.*
Сыне, Адкупіцель свету, Божа,
Духу Святы, Божа,
Святая Тройца, адзіны Божа, – *змілуйся над намі.*
Святая Марыя, – *маліся за нас.*
Святая Багародзіца,
Святая Панна над паннамі,
Маці Хрыстова,
Маці Касцёла,
Маці ласкі Божай,
Маці міласэрнасці,
Маці надзеі,
Маці прачыстая,
Маці беззаганная,
Маці непарушная,
Маці нявінная,
Маці наймілейшая,
Маці найцудоўнейшая,
Маці добрай рады,
Маці Стварыцеля,
Маці Збавіцеля,
Панна наймудрэйшая,

Панна, хвалы годная,
Панна праслаўлёная,
Панна магутная,
Панна ласкавая,
Панна верная,
Люстра справядлівасці,
Сталіца мудрасці,
Прычына нашай радасці,
Святыня духоўная,
Святыня хвалебная,
Святыня слаўная пабожнасці,
Ружа містычная,
Вежа Давідава,
Вежа з косці слановай,
Залаты доме,
Каўчэг Запавету,
Брама нябесная,
Зорка ранішняя,
Аздараўленне хворых,
Прытулак грэшных,
Палёгка мігрантаў,
Суцяшальніца засмучаных,
Успамога хрысціянаў,
Каралева анёлаў,
Каралева патрыярхаў,
Каралева прарокаў,
Каралева Апосталаў,
Каралева мучанікаў,
Каралева веравызнаўцаў,
Каралева паннаў,
Каралева ўсіх святых,
Каралева, без граху першароднага зачатая,
Каралева ўнебаўзятая,
Каралева Ружанца святога,

Каралева сем’яў,

Каралева супакою,

Каралева Беларусі, – *маліся за нас*.

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *даруй нам, Пане.*

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *выслухай нас, Пане*.

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *змілуйся над намі*.

С.: Маліся за нас, Святая Багародзіца.

Н.: Каб сталіся мы годнымі абяцанняў Хрыстовых.

*Молімся:* Просім Цябе, Пане Божа, дазволь нам, слугам Тваім, цешыцца трывалым здароўем душы і цела, і праз слаўнае заступніцтва Найсвяцейшай заўсёды Панны Марыі май ласку вызваліць нас ад цяперашняга смутку і адарыць вечнай радасцю. Праз Хрыста, Пана нашага.

Н.: Амэн.

## Тваёй абароне

Тваёй абароне аддаёмся, Святая Багародзіца, у нашых патрэбах не пагарджай маленнем нашым. І ад усялякай злой прыгоды выбаўляй нас заўсёды, Панна хвалебная і благаслаўлёная.

О Пані наша, Апякунка наша, Суцяшальніца наша, Ты Заступніца наша, з Сынам сваім нас паяднай, Сыну свайму нас даручай, Сыну свайму нас аддавай.

## Малітва св. Бэрнарда

Памятай, о Найсвяцейшая Панна Марыя, што ніколі не здаралася, каб пакінула таго, хто да Цябе ўцякае, Цябе на дапамогу кліча, Тваёй апекі просіць. Гэтым даверам натхнёны, да Цябе, о Панна над паннамі і Маці наша, імкнуся, да Цябе прыходжу, перад Табою, грэшны, плачучы, стаю. О Маці Слова, не пагарджай словамі маімі, але пачуй іх ласкава і выслухай. Амэн.

## НАВЭННА. Разважанне перад Вяночкам

***Молімся за памерлых святароў і кансэкраваных асобаў, за памерлых удзельнікаў рэлігійных рухаў, а таксама за тых, хто загінуў ад праследу за веру, і за душы, церпячыя ў чыстцы.***

Наш абавязак — заўсёды памятаць пра тых, хто адышоў у вечнасць — пра святароў, кансэкраваных асобаў, што прысвяцілі сваё жыццё служэнню Богу і людзям, памятаць пра тых, хто сваім жыццём даў прыклад мужнасці веры, хто вытрываў праслед, хто не адмовіўся ад крыжа Хрыста, хто аддаў сваё жыццё за Езуса. Касцёл таксама памятае ўсіх вернікаў, якія жылі ў веры, надзеі і любові, але яшчэ чакаюць уваходу ў вечную радасць і прагнуць нашых малітваў. Няхай наша агульная малітва стане святлом на іх шляху і падтрымкай у ачышчальным чаканні сустрэчы з Айцом. Але не толькі малітвай мы можам дапамагчы душам, церпячым у чыстцы. Можам ахвяраваць за іх свае цярпенні, свой боль, а таксама самую галоўную і дзейсную дапамогу — святую Імшу і адпусты.

Святому айцу Піо, манаху капуцыну, вялікаму містыку і стыгматыку, была дадзена ласка бачыць і размаўляць з душамі, церпячымі ў чыстцы. Ён марыў, каб чысцец быў пустым, каб як мага хутчэй мы, вернікі, сваімі міласэрнымі ўчынкамі, постам, малітвамі, ахвяраваннем сваіх цярпенняў — і фізічных і духоўных — дапамаглі гэтым душам дасягнуць неба. Ён часта паўтараў: «Мы павінны маліцца за душы ў чыстцы. Цяжка нават уявіць, колькі яны могуць зрабіць для нашага духоўнага дабра з-за удзячнасці да тых, хто памятае іх на зямлі і моліцца за іх. Малітва таго, хто пакутуе і, ахвяруючы гэтыя пакуты, просіць Божых ласкаў для дабра бліжніх, вельмі прыемная Богу; яна дасягае глыбіні Божага Сэрца. Малітва душаў у чыстцы больш эфектыўная ў вачах Бога, таму што яны пакутуюць. Таксама айцец Піо казаў пра тое, што лёс душы вынікае з духоўнага стану ў апошнія хвіліны перад смерцю, нават залежыць ад яго, ад тых апошніх праблёскаў веры і скрухі, якія могуць выратаваць душу ад небяспекі духоўнай смерці.

Езус казаў святой сястры Фаўстыне (Дз 811): «*У гадзіну смерці Я абараняю кожную душу, як сваю хвалу, калі яна моліцца Вяночак, або калі пры паміраючым яго памоляцца іншыя — яны атрымаюць такі самы адпуст. Калі пры паміраючым моляцца Вяночак, уціхамірваецца Божы гнеў, неспасцігальная міласэрнасць атуляе душу і ўзварушваюцца глыбіні Божай міласэрнасці дзеля Маёй балеснай мукі.* О, калі б усе зразумелі, — піша святая сястра Фаўстына, — якая вялікая міласэрнасць Пана, але як жа ўсім нам патрэбная гэтая міласэрнасць, асабліва ў вырашальную гадзіну адыходу».

*Найдаражэйшая Кроў Пана нашага Езуса Хрыста, пагасі агонь чыстца!*

**Малітва перад Вяночкам**

*Молімся за душы ў чыстцы:*

Езу найміласэрнейшы, Ты сказаў: «Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны» (Лк 6, 36), прымі ў дом Твайго Найлітасцівейшага Сэрца душы, якія пакутуюць у чыстцы.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы, якія пакутуюць у чыстцы, і праз балесную муку Езуса Хрыста і праз горыч, якою было заліта Яго Найсвяцейшае Сэрца, акажы ім міласэрнасць сваю. Просім Цябе, каб глядзеў на іх не інакш, як толькі праз раны Наймілейшага Сына свайго, бо верым, што дабрыня Твая і літасць бязмежныя. Амэн.

## Вяночак да Божай Міласэрнасці

Напачатку: *Ойча наш... Вітай, Марыя... Веру ў Бога...*

На вялікіх пацерках: Ойча Спрадвечны, ахвярую Табе Цела і Кроў, Душу і Боскасць наймілейшага Сына Твайго і Пана нашага, Езуса Хрыста, каб перапрасіць за грахі нашыя і ўсяго свету.

На малых пацерках:

Дзеля Яго балеснай му́кі будзь міласэрны да нас і да ўсяго свету.

На заканчэнне: Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, – змілуйся над намі і над усім светам! *(3 разы)*

О Кроў і Вада, якая выплыла з Найсвяцейшага Сэрца Езуса як крыніца Міласэрнасці для нас, давяраю Табе. *(3 разы)*

Езу, давяраю Табе. *(3 разы)*

## Літанія да Найдаражэйшай Крыві Пана нашага Езуса Хрыста

Кірые, элейсон, *Хрыстэ, элейсон, Кірые, элейсон.*

Хрыстэ, пачуй нас, *Хрыстэ, выслухай нас.*

Ойча з неба, Божа, – *змілуйся над намі.*

Сыне, Адкупіцель свету, Божа,

Духу Святы, Божа,

Святая Тройца, адзіны Божа, – *змілуйся над намі.*

Кроў Хрыста, Адзінароднага Сына Айца Спрадвечнага, – *выбаў нас.*

Кроў Хрыста,уцелаўлёнага Слова Божага,

Кроў Хрыста, новага і вечнага Запавету,

Кроў Хрыста, якая сплывала на зямлю пры кананні ў садзе Аліўным,

Кроў Хрыста, якая сцякала пры бічаванні,

Кроў Хрыста, якая сачылася з-пад цярнёвай кароны,

Кроў Хрыста, на крыжы пралітая,

Кроў Хрыста, расплата за нашае збаўленне,

Кроў Хрыста, без якой няма прабачэння,

Кроў Хрыста, якая ў Эўхарыстыі поіць і ачышчае душы,

Кроў Хрыста, крыніца міласэрнасці,

Кроў Хрыста, якая перамагае злых духаў,

Кроў Хрыста, мужнасць мучанікаў,

Кроў Хрыста, моц веравызнаўцаў,

Кроў Хрыста, крыніца чыстасці паннаў,
Кроў Хрыста, падтрымка ў небяспецы,
Кроў Хрыста, прахалода працуючых,
Кроў Хрыста, суцяшэнне смуткуючых,
Кроў Хрыста, надзея ў пакаянні,
Кроў Хрыста, палёгка паміраючых,
Кроў Хрыста, супакой і радасць сэрцаў нашых,
Кроў Хрыста, задатак жыцця вечнага,
Кроў Хрыста, збаўленне душаў чыстцовых,
Кроў Хрыста, усялякай хвалы і пашаны найдастойнейшая, – *выбаў нас.*

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *даруй нам, Пане.*

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *выслухай нас, Пане.*

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *змілуйся над намі.*

*С.:* Адкупіў Ты нас, Пане, крывёю сваёю.

*Н.:* І ўчыніў нас валадарствам Бога нашага.

*Молімся:* Усемагутны вечны Божа, Ты Адзінароднага Сына свайго ўстанавіў Адкупіцелем свету і праз кроў Ягоную даў магчымасць вымаліць прабачэнне. Дай нам, просім, годна ўшаноўваць Ахвяру нашага збаўлення і праз яе мець абарону ад зла часовага на зямлі, каб радавацца вечнаму шчасцю ў небе. Праз Хрыста, Пана нашага.

*Н.:* Амэн.

## Малітва да Крыві Хрыстовай

Пане Езу, наш Валадар і Збаўца! Верым, што кожную кроплю сваёй Найдаражэйшай Крыві Ты праліў, каб адкупіць і збавіць нас.

Няхай Твая Найдаражэйшая Кроў, пралітая на крыжы і ахвяраваная на алтарах усяго свету падчас кожнай святой Імшы, вызваліць нас ад грахоў, абароніць ад нападкаў злога духа, ацаліць нашыя душы і целы ад усіх слабасцяў і залежнасцяў. Няхай яна абароніць наш Касцёл, святароў, усе нашыя супольнасці, сем'і, дзяцей, моладзь і ўсіх нашых блізкіх, нашыя дамы і месцы, дзе мы прабываем.

Пане Езу, адкрый нашыя сэрцы на Тваю любоў і ласку. Умацуй нашую веру і еднасць, каб мы заўсёды памяталі пра цану нашага адкуплення і ўсім сэрцам адказвалі на Тваю любоў. Амэн.